ISSN 0203-2031

# Адукацыя і Выхаванне

У нумары:

Профільнае навучанне як праблема кіравання развіццём рэгіянальнай сістэмы адукацыі

Актуальныя праблемы педагогікі і псіхалогіі

Здаровы лад жыцця: дзеці і зрок

Вучоныя ступені. Вучоныя званні

Хачу ўсё ведаць

12 · 2005



## З гісторыі адукацыі

# Этыка-педагагічныя погляды Андрэя Волана

**В.С.Болбас,**
**І.С.Сычова**
*(Мазырскі дзяржаўны педагагічны універсітэт)*

***Навуковы патэнцыял сучаснай айчыннай тэорыі і практыкі выхавання можна значна ўзбагаціць і дапоўніць, выкарыстаўшы спадчыну беларускіх асветнікаў, якая заснавана на добрым веданні мясцовага жыцця і нацыянальнай псіхалогіі, але пакуль недаацэньваецца або знаходзіцца ў цяні больш вядомых імёнаў. Між тым інтэлектуалы ранейшых эпох прадчувалі многія выхаваўчыя і грамадскія праблемы, якія ўласцівы і нашаму часу, выступалі супраць аднабаковага падыходу да чалавека, распрацоўвалі асноўныя кірункі айчыннай педагагічнай думкі.***

Арыгінальную выхаваўчую канцэпцыю можна вылучыць у творах Андрэя Волана (1530—1610) — выдатнага беларускага дзеяча эпохі Адраджэння. Найперш ён вядомы як філосаф, праваназнаўца, дыпламат. У сваіх творах мысліцель уздымаў пытанні свабоднага развіцця асобы, самаўдасканалення ў навуках і дабрачыннасці, выканання кожным свайго прадвызначэння на зямлі, разважаў аб магчымасцях зямнога чалавечага шчасця, паходжанні маральных і грамадскіх законаў. Пісаў Андрэй Волан на лацінскай мове, што было папулярна пры каралеўскім двары і ў навуковых колах, а таксама з'яўлялася данінай павагі мудрацам антычнасці. Асветнік таленавіта выкарыстоўваў і інтэрпрэтаваў іх ідэі для вызначэння магчымых шляхоў развіцця айчыннай філасофіі выхавання, спалучаючы ў сваёй творчасці хрысціянскі і рэнесансна-гуманістычны падыходы.

Вучыўся А.Волан ва універсітэтах Франкфурта-на-Одэры і Кёнігсберга, выдатна ведаў антычную літаратуру, гісторыю і філасофію, што аказала ўздзеянне на фарміраванне светапогляду мысліцеля, вызначыўшы яго гуманістычныя ідэі. А.Волан стаў паўнапраўным грамадзянінам Вялікага княства Літоўскага, атрымаўшы маёнтак непадалёку ад Ашмян, дзе пражыў большую частку свайго жыцця. Доўгі час займаў пасаду каралеўскага сакратара, прадстаўляў інтарэсы шляхты Ашмянскага павета на сойме Рэчы Паспалітай, прымаў удзел у дыпламатычных місіях. Як палеміст-рэфарматар, Андрэй Волан выдатна валодаў пяром, як юрыст і дыпламат — навукай красамоўства. Вучоны з'яўляецца аўтарам каля 30 прац, з якіх найбольш вядомыя «Пра палітычную або грамадзянскую свабоду» (Кракаў, 1572), «Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро» (Вільня, 1596), «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці» (Гданьск, 1608). У сваіх творах ён адстойваў прынцыпы верацярпімасці, распрацоўваў канцэпцыю свабоды чалавека, заклікаў да вырашэння сацыяльных праблем на маральным, маральна-прававым узроўнях. А.Волан верыў у творчы патэнцыял асобы і перавагу лепшых маральных якасцей не толькі ў душы асобнага чалавека, але і ў грамадстве ў цэлым. Маючы на ўвазе ўсіх жыхароў Вялікага княства Літоўскага, многанацыянальнай дзяржавы, аснову якой складаў беларускі этнас, ён пісаў: «Наш літоўскі народ вызначаецца норавамі, набожнасцю і ўсякімі харошымі якасцямі настолькі, што сваімі дабрачыннасцямі можа з поспехам пасапернічаць з іншымі народамі» [1, с. 104].

У ацэнцы паводзін людзей А.Волан зыходзіў з меркавання, што маральны закон з'яўляецца прыроджаным, і ён замацаваны прыродай у розуме кожнага індывіда. Наяўнасць чалавечых заган і недахопаў мысліцель тлумачыў недасканаласцю розуму, дзе тояцца згубныя памкненні, а ў больш позні перыяд творчасці — грэшнасцю чалавека. Ён заклікаў да самавыхавання праз развіццё сілы волі, набыццё ведаў, абмежаванне жаданняў, захаван-

не спакойнага, разважлівага стану. Галоўнымі ў «выхаванні чалавечага роду» А.Волан лічыў рэлігію, навуку, дабрачыннасць, якія абавязкова павінны падтрымлівацца заканадаўчымі нормамі. Нягледзячы на пэўныя сумненні, асабліва ў больш позні перыяд творчасці, ён дапускаў магчымасць дасягнення чалавечага шчасця ў зямным жыцці, пры ўмове значных душэўных намаганняў, захавання справядлівасці і падпарадкавання законам. Бог для асветніка з'яўляўся непадкупным суддзёю, які бачыць усе людскія справы і ад якога нельга схаваць свае намеры. Гэта, тым не менш, не выключала самакаштоўнасці асобы і самастойнага вызначэння лініі паводзін, бо ад нараджэння чалавек надзяляецца свабодай выбару. Найважнейшая задача грамадства заключаецца ў выхаванні такога чалавека, які ў дабрачынным жыцці бачыць сэнс свайго існавання. Хрысціянска-гуманістычны маральны заклік рэфармацыйнага кірунку з вуснаў Андрэя Волана прагучаў наступным чынам: «Аднак чалавек павінен дасягнуць такой ступені свядомасці, каб яго ўтрымліваў ад злосных учынкаў не страх перад божым судом, а любоў да Бога і пакора боскім наказам» [1, с. 98].

Замацаванню прынцыпаў гуманізму і нормаў агульначалавечай маралі ў айчыннай педагагічнай тэорыі і практыцы спрыяла шырокае распаўсюджанне твораў антычных аўтараў. У Беларусі эпохі Адраджэння былі вядомы маральна-этычныя вучэнні стоікаў, эпікурэйцаў, рэнесанснага гуманізму. Большасць асветнікаў, у тым ліку Ф.Скарына, М.Літвін і А.Волан, прытрымліваліся канцэпцыі грамадзянскага гуманізму. Яна грунтавалася як на этыцы Цыцэрона, так і на народным светапоглядзе, і ставіла клопат аб агульным дабрабыце вышэй за асабістыя патрэбы.

Плюралізм, супастаўленне розных думак і меркаванняў, характэрныя для гэтай эпохі, назіраюцца і ў трактаце Андрэя Волана «Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро». Ён напісаны ў форме дыялога паміж шасцю асобамі, якія з'яўляюцца прыхільнікамі розных вучэнняў аб сутнасці існавання чалавека. Аўтар спрабуе спалучыць хрысціянскую этыку з поглядамі Платона, Арыстоцеля, Цыцэрона, ідэямі гуманізму эпохі Адраджэння. Яму імпануе і заклік стоікаў да захавання душэўнай раўнавагі ў складаных жыццёвых сітуацыях, і погляд эпікурэйцаў на чалавека як на духоўна-цялеснае адзінства, і рэнесанснае імкненне да славы, самасцвярджэння праз развіццё інтэлекту і асабістыя заслугі перад Радзімай. Заканчваецца трактат ухваленнем хрысціянскіх каштоўнасцей. Але адказ на складаныя пытанні не быў для мысліцеля раз і назаўсёды дадзеным, ён выкрышталізоўваўся ў дыялогу, метадам супастаўлення і аналізу розных пазіцый. Гэта ўвогуле характэрна для педагагічных поглядаў А.Волана, якія ўдакладняліся і канкрэтызаваліся з твора ў твор, на працягу жыцця. Думаецца, бліжэй за ўсё айчыннаму асветніку была пазіцыя Платона, разуменне выхавання і навучання як пошуку індывідуальнага прадвызначэння, а праз гэта — шляхоў служэння свайму народу. У трактаце «Пра шчаслівае жыццё» адзначаецца: «Так ужо прынята ў людзей, што ў жыцці ўсе яны не могуць рабіць адно і тое ж, і згодна розных талентаў і лёсаў кожны атрымлівае сваю справу. У вялікай разнастайнасці заняткаў кожнаму дастаецца падыходзячая яму сфера дзейнасці» [2, с. 130].

Рэалізаваць свае здольнасці чалавек можа толькі ў грамадстве, пры пэўнай свабодзе выбару. Свабода — цэнтральнае паняцце светапогляду Андрэя Волана, падмурак усёй сістэмы грамадскіх і асабістых каштоўнасцей, аснова той філасофіі выхавання, якой ён надае выразную сацыяльную накіраванасць. Як і філосафы антычнасці, Волан цесна збліжае этыку, педагогіку і палітыку, падкрэсліваючы грамадскі характар выхавання. Пры гэтым вучоны, высока ацэньваючы ролю самаўдасканалення, на адно з першых месцаў у забеспячэнні свабоднага развіцця асобы вылучае заканадаўства. Ні супольнасць, ні індывід, па яго глыбокім перакананні, не могуць існаваць паўнацэнна без свабоды, якой чалавек надзелены ад прыроды. І нават мудрасць без свабоды губляе сэнс, бо мудрэц не зможа дасягнуць шчасця, правільна карыстацца дабротамі, «калі адначасова не будзе валодаць і дарам свабоды» [3, с. 10]. Мысліцель упэўнены, што свабода патрабуе заканадаўчых гарантый. Згодна з перакананнямі А.Волана, дзяржавы і ствараюцца дзеля таго, каб «людзі маглі ў згодзе і ўзаемадапамозе шчасліва і благаславенна жыць» [4, с. 77]. Закон для А.Волана — гэта ўвасабленне нормаў маралі на дзяржаўным



*Валерый Сяргеевіч Болбас у 1970 годзе скончыў механіка-матэматычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў настаўнікам, завучам, дырэктарам школ Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці. У 1993 годзе абараніў кандыдацкую дысертацыю па гісторыі педагогікі Беларусі. З 1995 года працуе ў Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце на пасадах загадчыка кафедры педагогікі (1996), прарэктара па навуковай рабоце (1998), прарэктара па вучэбнай рабоце (2000).*

*Даследчык гісторыі педагогікі і народнай педагогікі Беларусі. Аўтар больш чым 100 навуковых прац, у тым ліку манаграфіі «Ідэі маральнага выхавання ў педагагічнай думцы Беларусі эпохі Адраджэння» (1998), двух вучэбных дапаможнікаў.*

узроўні, і ён павінен адлюстроўваць толькі тое, «да чаго сам розум шлях указвае». Таму зыходна ён мае прыроднае паходжанне. Імкненне чалавека да свабоды таксама вынікае з яго прыроды, але, паводле А.Волана, не павінна перавышаць меру, каб не перарадзіцца ў беззаконнасць. У адносінах да закону мера — гэта адпаведнасць прыроднаму пачуццю справядлівасці, а ў пытаннях выхавання чалавека — гарманічнае развіццё асобы, якое грунтуецца на правільным карыстанні дабротамі і асабістай свабодзе.

Мысліцель вылучае тры віды даброт: духоўныя (розум, талент), цялесныя (здароўе, прыгажосць), фартуны, ці лёсу (багацце, тытулы). У сваёй класіфікацыі ён абапіраецца на Платона і Арыстоцеля, для якіх існавалі даброты розуму, або боскія, і даброты цела і маёмасці, або людскія. На думку айчыннага асветніка, знешнія даброты, або, паводле Арыстоцеля, эўтыхія, павінны выконваць ролю інструмента, які б накіроўваў і схіляў чалавека да духоўнага ўдасканалення. А.Волан неаднаразова падкрэслівае, што правільнае выкарыстанне даброт, заснаванае на свабодзе і справядлівасці, вядзе да дабрачыннасці, вызначае гарманічнае развіццё чалавека. У поглядах А.Волана цесна перапляталюцца паняцці «мера» і «калакагатыя». Калакагатыя (грэч. *прыгожы і добры*) — ідэал фізічна і маральна дасканалай асобы, запазычаны ў грэчаскай культуры і па-свойму ўвасоблены ў розныя эпохі — як ідэал мудраца, рыцара, фальклорнага героя і г.д.

Андрэй Волан верыць, што ў чалавеку пераважае добры пачатак. Але схільнасць да дабра, таленты і мудрасць праяўляюцца ў кожнага ў рознай ступені: у адных — больш, у другіх — менш. Асветнік дапускае меркаванне, што адпаведна закону прыроды, сыны павінны быць цалкам падобнымі да бацькоў, а «існуючыя ў продкаў задаткі дабрачыннасці аказваюцца прывітымі ў розуме нашчадкаў» [3, с. 11]. Здавалася б, па гэтым законе наследуюцца не толькі фізічныя, але і маральныя якасці. Але ў чалавечым грамадстве ўсё больш складана. Па словах асветніка, марнымі з'яўляюцца намаганні надаць дакладна акрэсленую форму такой шматграннай з'яве, як фактар спадчыннасці. Працэс станаўлення асобы, дзе значная роля належыць самавыхаванню, не можа быць абумоўлены толькі законам прыроды.

Андрэй Волан прыхільна ставіцца да саслоўнага падзелу грамадства і лічыць яго справядлівым. Тым не менш ён прызнае, што нярэдка дзякуючы якасцям, дадзеным ад Бога, выхаванню і ўласным намаганням чалавек, нягледзячы на яго паходжанне, можа ўзняцца да сацыяльна-маральных вяршынь. Адсутнасць жа намаганняў і жаданняў да маральнага ўдасканалення можа, наадварот, чалавека знатнага роду апусціць на найніжэйшую прыступку саслоўна-іерархічнай лесві-

*Іна Сяргееўна Сычова, асістэнт кафедры педагогікі Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. Скончыла ў 1987 годзе філалагічны факультэт БДУ. Працавала ў Казацка-Балсунскай базавай школе Веткаўскага раёна, мазырскай аб'яднанай газеце «Жыццё Палесся», сярэдняй школе № 2 г. Мазыра. У 2005 годзе скончыла аспірантуру пры Мазырскім дзяржаўным педагагічным універсітэце. Сфера навуковых інтарэсаў — гісторыя народнай педагогікі ў Беларусі.*





158

цы грамадства. Асветнік адзначае: «І часта сыны бацькоў нізкага роду бываюць надзелены такімі вялікімі талентамі, што дзякуючы сваёй уласнай дабрачыннасці становяцца вельмі слаўнымі і знакамітымі. А часта дзеецца і адваротнае: нашчадкі славутых продкаў выраджаюцца да такой ступені, што сіляцца дабрачыннасці сваіх бацькоў зацьміць уласнымі злачынствамі» [3, с. 11]. У адпаведнасці з патрабаваннямі эпохі Адраджэння і рэфармацыйнай этыкі, айчынны мысліцель сцвярджае, што сапраўдную каштоўнасць мае набытае індывідуальнае высакародства, а не проста атрыманы ў спадчыну аўтарытэт. Нават калі шляхецтва абапіраецца не толькі на багацце, але і на слаўныя справы продкаў, гэта не гарантуе, што нашчадкі будуць весці бездакорнае жыццё. Так, праслаўлены імператар Германік пакінуў пасля сябе сына Калігулу — увасабленне злачынства, а цэзар Аўгуст цярпеў ганьбу ад паводзін дачкі і ўнучкі — прыводзіць А.Волан прыклады са старажытнай гісторыі. Ён канстатуе, што, «на жаль, нараджаюцца дзеці ад бацькоў разумных — не мудрыя, ад вучоных — невукі, ад справядлівых і літасцівых — лютыя тыраны» [3, с. 11]. Асветнік прыходзіць да пераканання, што ў спадчыну можна атрымаць багацці і тытулы, але толькі не высокія маральныя якасці, мудрасць і адукаванасць, бо яны здабываюцца настойлівасцю, стойкасцю і добрымі ўчынкамі. На яго думку, толькі той высакародны чалавек будзе варты сваіх продкаў, які да прыродных задаткаў дадасць высокую культуру. Больш таго, асветнік прапануе новы прынцып фарміравання шляхецкага саслоўя. На яго думку, туды можна залічваць усіх людзей, якія маюць высокія маральныя якасці і заслугі перад грамадствам. А.Волан сцвярджае: «Шляхтай не нараджаюцца, а становяцца» [4, с. 78].

Вучоны не адмаўляе таго, што факт нараджэння ў прыстойнай і забяспечанай сям'і дае добры пачатак у жыцці, стварае ўмовы для павышэння культурна-адукацыйнага ўзроўню, росквіту талентаў, але дабрачыннасць лічыць вынікам самавыхавання і індывідуальнай працы. Асветнік-рэфарматар зазначае, што чалавеку нешляхецкага паходжання цяжка заняць належнае становішча ў грамадстве: перашкаджаюць зайздрасць, варожыя адносіны да чужакоў. І толькі выключная адоранасць, настойлівасць і працавітасць дазваляюць пераадолець перашкоды і дабіцца прызнання. Хаця і з агаворкамі, але А.Волан набліжаецца да гуманістычных поглядаў педагогаў Адраджэння аб інтэлектуальнай роўнасці людзей розных саслоўяў, неабходнасці ўсеагульнага навучання і выхавання, каб найлепш садзейнічаць раскрыццю талентаў.

Вучоны лічыць, што людзі няроўныя ў сваіх магчымасцях і схільнасцях, некаторым навукі даюцца лягчэй, і яны маюць больш плён пры меншых намаганнях: «... істотна больш зародкаў дабрачыннасцей прывіта ў душы некаторых людзей, але абудзіць іх да жыцця можна толькі вялікімі намаганнямі, стараннасцю і працай. Лянівы ж, як урадлівы, але занядбаны загон, замест зерня дае толькі пустазелле» [3, с. 11]. Тым самым асветнік засяроджвае ўвагу на ўліку індывідуальных асаблівасцей у выхаванні. Педагог пастаянна падкрэслівае значнасць самавыхавання, практыкі і вопыту ў любой дзейнасці. Паводле А.Волана, нельга стаць годным членам грамадства, дабіцца поспеху ў жыцці без настойлівай працы і выхавання. На думку асветніка, неабходна таксама пастаяннае практыкаванне розуму і характару, інакш сфарміраваныя маральныя звычкі і дасягненні ў навуках страцяць сваю сілу. «Таму што ў розуме чалавечым хаваецца нешта падобнае на іскарку, ад якое — калі падзьмеш і дроў пакладзеш — разгарыцца вялікае полымя. Калі ж перастанеш старацца і спыніш свае намаганні, то лёгка можаш зусім затушыць іскарку і тады не будзе аніякага полымя» [3, с. 11], — піша А.Волан у трактаце «Аб палітычнай альбо грамадзянскай свабодзе». Прыхільнік ідэй Рэфармацыі, мысліцель услаўляе працалюбства і настойлівасць, якія дапамаглі ўзняцца з нізоў грамадства многім выдатным дзеячам Адраджэння.

1. *Волян, Андрэй.* Пра дзяржаўнага мужа і яго асабістыя дабрачыннасці // Спадчына. — 1991. — № 6. — С. 95—104.

2. *Падокшын, С.А., Шатон, В.К.* Андрэй Волан і яго трактат «Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро» // Весці АН БССР. Сер. Грамад. навукі. — 1981. — № 1. — С. 125—132.

3. *Волан, Андрэй.* Аб палітычнай альбо грамадзянскай свабодзе // Культура. —1994. — 15 чэрвеня. — С. 10—11.

4. Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.). — Мн.: Наука и техника, 1973. — 560 с.